**Касцень, А.** Матчыны сны / А. Касцень // Звязда (Пастаўскі р-н). — 1989. — 23 мая. — С. 2.

**МАТЧЫНЫ СНЫ**



У адну з лютаўскіх субот 84-га Клеапатра Аляксандраўна атрымала ліст ад сына. Пазнала знаёмы почырк, захвалявалася. А потым, прачытаўшы радкі сына аб тым, як служыць, як ваюе (так-так, ліст быў прысланы з Афганістана) засабіралася ў Паставы, да дачкі. Трэба ж і ёй паказаць, каб і яна парадавалася: Рэнік вестачку прыслаў. Дабралася да родных. Парадаваліся разам. А ў панядзелак у Волахі завітаў вайсковец. «Трымайцеся, маці. Хутка прывязуць вашага сына». Вось так...

Што перажывала ў гэты момант маці, апісаць цяжка. Ды і пачынае кожны разумець такое толькі тады, калі і да яго, у яго сям'ю прыходзіць гора.

Адгучалі жалобныя словы развітання, вярнулася ў сваю часць ганаровая вайсковая варта, разышліся, раз'ехаліся пасля жалобнага стала сваякі і суседзі. А маці засталася адна. Прыходзіць сын у матчыны сны. «Часам нібы пакліча да сябе сыночак».

Шосты год так жыве ў Волахах Клеапатра Аляксандраўна Мішута. Жыве адна, за год да смерці сына пахаваўшы гаспадара. Не будзем гаварыць аб яе адзіноце. Прыязджае дачка, яе дзеці, прыязджае з Рыгі і нявестка са сваімі. Але ж гэта госці, пабылі ў выхадныя – і паехалі. А ў будні маці адна, глядзіць невялікую, па сілах, гаспадарку, ходзіць да сына. На дагледжаных вясковых могілках стаіць помнік. Пастаўлены ён на дзяржаўныя сродкі.

Што ж, Радзівон Сяргеевіч Мішута аддаў дзяржаве шмат. Яго біяграфія тыпічная, як гэта любяць пісаць. Нарадзіўся ў 1953 годзе. Закончыў 10 класаў. Сваей дарогай выбраў вайсковую. Паступіў у вучылішча толькі з другога разу. Год паміж экзаменамі на шыі ў бацькоў не сядзеў, працаваў у калгасе. Ну а пасля вучылішча – знаёмыя афіцэрскія вандроўкі. Спачатку адзін, потым з сям'ёй. І Адэса, і далёкія Курылы, і Далёкі Усход, і Прыбалтыка. У Афганістане Радзівон праслужыў сем месяцаў, у тым, апошнім лісце дадому пісаў, што неўзабаве прыедзе ў адпачынак. Але ў час адной з аперацый на іх баявой машыне выйшла са строю рацыя. Трэба было некаму выбірацца з-пад брані. Павінен гэта, канечне, зрабіць падначалены. Але капітан Мішута сказаў: «Я сам».

Выйшаў на такую негасцінную для нашых хлопцаў афганскую зямлю, і разрыўная куля трапіла ў шыю...

Гавораць, яму ўжо нічога не трэба. Але трэба. Памяць. І памяць, якая апасрэдуецца не толькі ў тым: адзін раз на год наведаць магілкі, ускласці кветк, сказаць словы пашаны і жалобы. Патрэбна такая памяць, кааб і жонка, і дзеці, і маці адчувалі іх кожны раз, без выключэнняў і спасылак на забыўлівасць.

Каюся, не хапіла ў нейкі момант нашай нядаўняй сустрэчы з Клеапатрай Аляксандраўнай такту, і я закрануў усяго адным-другім словам балючую тэму мэтазгоднасці той, ужо мінулай вайны. Яна скрозь слёзы глянула на мяне:

– А нашто ж выпраулялі. Колькі іх, такіх цвятоў, палягло?

І сапраўды, радавы ўдзельнік афганскіх падзей, акопны, як казалі б пра франтавіка Айчыннай, чалавек не вінаваты ні ў чым. Як члену адной камісіі райвыканкома, мне даводзілася аб'язджаць воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Напісаў гэта і задумаўся: названа неяк вельмі ўжо нейтральна, самі яны называюць сябе ярчэй – «афганцы». Дык вось аб'язджаў, распытваў аб патрэбах, аб клопатах і не сустрэў з іх боку імкнення нешта ўрваць, адхапіць. Ёсць патрэбы, безумоўна, і іх трэба задавальняць. І стварыць у нашым асяроддзі такую абстаноўку, калі чалавек, які пабываў пад кулямі, будзе зразуметы, калі той, хто лёг пад кулямі, выконваючы свой абавязак перад дзяржаваю, не будзе забыты.

Я, расказваючы пра Радзівона Сяргеевіча Мішуту, яго маці, меў на ўвазе ўсіх загінуўшых, усіх маці, магчыма, і больш забытых, а то і пакрыўджаных. Азірнёмся вакол: успомнім загінуўшых, паклапоцімся аб жывых, не будзем надта наракаць на іх за няўжыўлівасць і абвостранае ўспрыняцце сваіх праблем. Яны ж прайшлі вайну.

**А. КАСЦЕНЬ**

На здымку: угледзімся ў гэты твар – капітан Радзівон Сяргеевіч Мішута